**Ірына Гоўзіч (Мінск)**

# ФОРМЫ ВЫЯЎЛЕННЯ ДРАМАТЫЧНАГА ПАЧАТКУ Ў ЛІРЫЦЫ ЯНКІ КУПАЛЫ І ЯНКІ СІПАКОВА: ДА ПРАБЛЕМЫ РОДАВАЙ ДЫФУЗІІ

Не кожны мастацкі твор можна лёгка і свабодна ўкласці ў рамкі трох родаў літаратуры эпасу, драмы і лірыкі. Таму прыналежнасць твора да таго ці іншага роду літаратуры ўяўляе сабой своеасаблівую «селекцыю», адбор і відазмяненне на базе захавання дамінантных змястоўна-відавых прыкмет. Гэтае «селекцыяніраванне» неабходнае яшчэ і таму, што род літаратуры ў працэсе свайго станаўлення і развіцця пастаянна фарміруецца, набывае адзнакі другога роду, і на сумежжы іх узаемадзеяння адбываецца жанрава-родавая дыфузія. Час сцірае трывалыя межы паміж лірыкай і эпасам, лірыкай і драмай.

Лірыка як род літаратуры -- неаднародная, рухомая і сінтэтычная з'ява, гэта ўжо не толькі апісанне прыроды і побыту, прапушчанае праз стан чалавечай душы, свядомасць мастака і чытача, пададзенае не толькі максімальна эмацыйна, але і сцішана-лагодна. Гэта таксама і дыялог – дыялог з часам, аднаго аўтара з другімі аўтарамі, аўтара з чытачом, з самім сабой, з «цэлым народам», з душой сваёй і з Богам. Яшчэ адна асаблівасць лірыкі заключаецца ў тым, што паэтава думка не ляжыць на паверхні, а вынікае з глыбіні душэўнага вопыту, што яна – пэўным чынам інтанаванае выказванне, якое залежыць ад прадмета ўвагі і адрасата. І ў той жа час у сучасным грамадстве лірыка – гэта аўтарскі маналог, як ні парадаксальна, пабудаваны па законах дыялогу, скіраваны на рэцыпіента-чытача. Лірыка з'яўляецца надзвычай дынамічным і «рухомым» родам літаратуры яшчэ і па той прычыне, што ўмоўнасць у ёй максімальная, што яна вольна карыстаецца не толькі катэгорыямі прасторы і часу (хранатоп) у фізічным значэнні гэтых слоў, але і стварае іх псіхалагічныя двайнікі, бо галоўная задача пісьменніка, а тым больш паэта – удала знайсці сугуччы слоў, што выклікаюць у свядомасці рэцыпіентаў чуйныя, складаныя, поўныя ўяўленні. Таму ў сучаснай лірыцы надзвычай выразна праяўляецца драматургічны пачатак, асабліва ў баладах і прытчах.

Значны ўнёсак у станаўленне і развіццё нацыянальнай «лірычнай традыцыі» ўнёс Янка Купала, які ў многіх сваіх творах далёка выходзіць за межы часу малога, бо дапаўняе канкрэтнае агульным, сацыяльна-кан'юктурнае, часовае – агульначалавечым. У яго спадчыне выразна адчуваецца паэтавы клопат пра час і лёс, святло і змрок, хваляванне і спакой, часовае і вечнае. Беларускі пясняр – постаць шматгранная, стыль яго шматаспектны і непаўторны ў арганічна паяднаных частках: імкненне да праўдападобнасці і нават натуралістычнага апісання суровых умоваў жыцця дарэвалюцыйнага сялянства і рамантычная пераствaральнасць у паэмах «Сон на кургане», «Адвечная песня», высокаснасць адычнага пафасу ў творах пра індустрыяльнае будаўніцтва даваеннага перыяду і элегічная жаласлівасць у многіх вершах 1918 – 1922 гадоў, фальклорная празрыстасць і ўскладненасць, што даходзіць да асацыятыўнай вобразнасці, устаноўка на агульнаўжывальную, усім зразумелую і ўнармаваную лексіку і пастаянная прага наватвораў, вышук малаўжывальных словаў. Лірыка паэта становіцца ў шырокім сэнсе дыялогам з папярэднікамі і нашчадкамі, у ёй з'яўляюцца элементы драматычнага роду: дыялогавасць, трывалая паслядоўнасць і сувязь падзей, хуткае разгортванне часу, развіты сюжэт пачуццяў і перажыванняў.

Напрыклад, у грамадзянскай лірыцы паэта пачатку XX стагоддзя паняцце «невідушчасці» атаясамліваецца з вобразам беларусаў – цёмных, сляпых, глухіх, забітых і загнаных. А самі творы па знешніх прыкметах нагадваюць драматычныя

творы («А ты, браце спі!» і «Што ты спіш?»): «Спі, а можа хто заблудзе // У твой бедны край // І цябе з душой разбудзе, – // Крыкне: «Уставай!» [4, с. 32], «Толькі ты, брат, адзін, // Як забіты ляжыш, // І на долю сваю // Не ўстаеш, не глядзіш» [4, с. 65]. Драматызм і трагедызм названых і многіх іншых Купалавых твораў надзвычай абвостраны. Аднак паэт шукае выйсце з трагедыйнай сітуацыі і, як сапраўдны мастак-грамадзянін, знаходзіць паратунак у роднай мове, матчынай песні, навуцы, якія выведуць «невідушчых» на святло з цемры, раскрыюць ім вочы на сапраўдную (адносна, вядома) ісціну і дапамогуць актыўна супрацьстаяць захопнікам і знішчальнікам духоўных, чалавечых каштоўнасцей беларусаў, якія ператвараюць іх у чужынцаў на роднай зямлі («Груган», «Беларускія сыны», іншыя творы 1918 – 1920-х гг.).

Падобная шырыня творчай праграмы і дазваляе спраецыраваць яго набыткі на скарбы і набыткі наступных пакаленняў.

Янка Сіпакоў – адзін з нямногіх беларускіх пісьменнікаў, у чыёй творчасці (асабліва ў баладах і прытчах) знайшлі ўніверсальнае паяднанне два літаратурныя роды – лірыка і драма, чыя духоўная і творчая эвалюцыя ўяўляе досыць цікавы феномен у сучаснай беларускай культуры, калі ўстаноўка на адноснасць жанравых форм і разам з тым на абсалютныя, вечныя чалавечыя духоўныя каштоўнасці гавораць аб аўтары як аб унікальнай творчай індывідуальнасці.

Балада Янкі Сіпакова сінтэзуе ў сабе лірычны, эпічны і драматургічны пачаткі. Аўтара балады цікавіць эпічнае здарэнне, але не само па сабе, а менавіта тым, што дае магчымасць паказаць веліч ці нізкасць чалавечага духу, выказаць свае адносіны да пэўнай з'явы. Драматычнасць жа балады абумоўлена складанасцю канфлікту паміж Дабром і Злом, імкненнямі чалавека да нечага светлага і немагчымасцю іх здзяйснення. Баладзе ўласцівыя гераічны пафас, што вынікае з трагедыйнай калізіі і трагедыйнага сюжэта, а таксама дынамізм, ад якога дзеянне «выходзіць напаверх», не губляецца, пераплятаецца з пачуццём, узбагачае і «актывізуе» яго.

Сучасная балада паспяхова развіваецца ў некалькіх жанрава-стылявых накірунках, пошук вядзецца і па лініі зместу, і па лініі формы (пашырэнне меж адлюстравання свету, паглыбленне філасофскай асновы, абагульненне абставін, эпізодаў, фактаў, характараў, стварэнне уражання прасторавай неабмежаванасці і часавай трохмернасці дзеяння, паяднанне адзнак трох родаў літаратуры).

Балада ў творчасці Янкі Сіпакова выступае ў чатырох галоўных разнавіднасцях: як чыста эпічная, калі ў яе аснову пакладзены падзеі, дзеянне; пераважна лірычная, у якой аўтар праз апісанне пачуццяў і перажыванняў лірычнага героя выяўляе свае адносіны да свету; выразна драматургічная, заснаваная на канфлікце і напружаным дзеянні; і сінтэтычная, якая з'яўляецца вынікам сінтэзу адзнак трох вышэйназваных разнавіднасцей.

Многія балады Янкі Сіпакова створаны ў адпаведнасці з патрабаваннямі драматургічных твораў: у іх аснове ляжыць востры канфлікт, матэрыял падаецца ў форме дыялогу.

Яскравым прыкладам падобнай разнавіднасці з'яўляецца балада «Разня», аснову якой складае размова маці і маленькага сына, з якой чытач даведваецца і пра жудасныя падзеі, і пра стаўленне да іх аўтара:

– Мамачка, мамка, чаму, паглядзіце,
Чырвоная рэчка такая?
– Сыне мой, сыне, у ёй не вадзіца –
То ж кроў наша, сыне, людская. [7, с. 323]

Звяртае на сябе ўвагу цікавая асаблівасць гэтага твора, як і многіх іншых балад Янкі Сіпакова, – паэт рэдка калі апісвае смерць герояў, а стварае «перадсмяротную сітуацыю», бо канец твора вядомы чытачу.

Як нам думаецца, Сіпакоў блізкі Купалу менавіта ўменнем спалучаць лірычнае пачуцце і размоўнасць, разважлівасць, засяроджвацца на малым, каб прыходзіць да значных філасофскіх вывадаў. Што ж тычыцца баладнай «пераклічкі» двух аўтараў, дык дастаткова прыгадаць рамантычныя паэмы класіка нашай літаратуры «Курган», «Магіла льва», «На Куццю», у якіх выразна выяўляецца трагедыйная калізія, не менш трагедыйная канцоўка мае такое ж катарсіснае значэнне, як у баладных творах.

Янка Сіпакоў шукае новых прынцыпаў адлюстравання рэчаіснасці. Яго наваствораны мастацкі свет адрозніваецца ад свету Івана Мележа і вельмі блізкі да свету, створанага Янкам Купалам і Васілём Быкавым у апошніх творах, дзе пануюць цемра, хаос, правяць баль змрочныя сілы зла, а чалавек застаецца каштоунасцю ў сабе, часта адзінокай, ды нязломнай.

Усё вышэйсказанае падмацоўвае наш тэзіс пра «разамкнёнасць» жанравай структуры сённяшняй лірыкі, узбагачэнне і карыстанне найлепшымі дасягненнямі іншых родаў літаратуры (у прыватнасці, драматычным).

Літаратура

1. **Григорьева А.Д., Иванова Н.Н.** Язык лирики XIX века: Пушкин. Некрасов. – М.,1981.
2. **Гіламёдаў Ул.** Янка Купала: Новы погляд. – Мн., 1995.
3. **Кузьмина С.Ф.** В поисках традиции: Пушкин – Мандельштам – Набоков. – Мн., 2000.
4. **Купала Я.** Жыве Беларусь: Вершы, артыкулы. – Мн., 1993.
5. **Рагойша В.П.** Вяршыні: З невядомага и забытага пра Янку Купалу, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча. – Мн., 1991.
6. **Сіпакоў Я.** Выбраныя творы ў 2 т. Т.1: Паэзія. – Мн., 1995.